**Караленка, В.** Сапраўдны палкоўнік / В. Караленка // Патрыёт (Ушачы). — 2009. — 17 кастр. — С. 3.

## САПРАЎДНЫ ПАЛКОЎНІК



Хто з хлопцаў не марыў стаць ваенным? Асабліва калі бацька загінуў на фронце, а сам ты памятаеш выбухі, нямецкую гаворку на родным падворку і пастаяннае пачуццё голаду. Калі ўсе равеснікі гуляюць толькі ў вайну і мараць апрануць вайсковую форму.

Марылі сапраўды многія. А вось так як Яўген Яўстафіевіч Качанаў з Крошына – адзінкі. Ён не проста летуценіў, а рабіў усё, каб стаць першым. Гады ў тры лічыў да ста, а у школу пайшоў, умеючы чытаць. Таму і адзін клас закончыў экстэрнам. Пешшу хадзіў за 12 кіламетраў у Вароніцкую школу, якую закончыў у 1958.

Адразу ж паступае ў Адэскае вышэйшае агульнавайсковае каманднае вучылішча і па размеркаванні трапляе ў Літву. Камандаваў танкавым узводам, мотастралковай ротай, парашутна-дэсантным батальёнам. Пасля траўмы, атрыманай падчас скачкоў, назначаны намеснікам начальніка грамадзянскай абароны горада Магілёва і Магілёўскай вобласці. Аднак маладому афіцэру хацелася вучыцца і спасцігаць новае. Ён заканчвае Вышэйшую ваенную акадэмію імя Фрунзе ў Маскве, абараняе дысертацыю і атрымлівае званне кандыдата ваенных навук. У 1979 годзе ўзначаліў кафедру тактыкі Ленінградскага вышэйшага ваеннага агульнавайсковага вучылішча імя Кірава і Ваеннага інстытута фізкультуры. Выкладчыцкую дзейнасць ён спалучаў з практыкай. Быў у складзе ваеннай дэлегацыі ў Дэмакратычнай рэспубліцы Йемен, удзельнік вайны ў Афганістане на пасадзе намесніка камандзіра мотастралковай дывізіі.

Узнагароджаны ордэнам «За службу Радзіме ва Узброенных Сілах СССР» III ступені, а таксама шматлікімі медалямі. З’яўляецца аўтарам 15 кніг па тактыцы.

У 1992 годзе ў званні палкоўніка ён пайшоў на ваенную пенсію, аднак працягваў выкладчыцкую дзейнасць у Санкт-Пецярбургскай акадэміі сувязі, прафесар кафедры Універсітэта міністэрства ўнутраных спраў Расіі, а таксама Універсітэта міністэрства па надзвычайных сітуацыях Расіі.

Многа чаго пабачыў, многа ведаў і многае цаніў. Асабліва сяброўства і сваю малую радзіму. Таму свой адпачынак праводзіў заўсёды на Ушаччыне. Прыязджаў спачатку да маці, а

потым проста ў бацькоўскі дом. Да яго часта звярталіся землякі, якім ён з радасцю дапамагаў. Па яго шляху пайшоў не толькі сын, але і некаторыя ўшацкія хлопцы, якія ведалі Яўгена Яўстафіевіча.

Нешматслоўны пра службу, ён, тым не менш, быў вельмі сяброўскім чалавекам і часта завітваў да цяпер ужо крошынскіх бабуль з пачастункамі, каб за чаем прыгадаць пасляваенныя часы, успомніць усіх вяскоўцаў.

Хоць пасля метамарфоз з запісам дакументаў яго прозвішча стала гучаць Качанаў, тым не менш ён з ушацкага роду Качан, якія жылі ў Мар'янполлі. Заўсёды ведаў сваё паходжанне і пахаваным хацеў быць толькі тут. Яго волю родныя выканалі, праводзіўшы ў верасні ў апошні шлях брата, дзядзьку і нашага земляка, імя якога знаходзіцца ў раённай кнізе «Памяць» і ў памяці тых, хто яго ведаў.

**В. Караленка**

На здымку: Я. Качанаў